Известия Гомельского государственного университета
имени Ф.Скорины, №1 (10), Беларуская мова – 26, 2002

# Ад’ектонімы, матываваныя тапонімамі рознай родавай прыналежнасці ў старабеларускай мове XVI – XVII стст.

З.У.Шведава

Даследаванне словаўтваральных працэсаў у галіне гістарычнай тапаніміі адносіцца да ліку актуальных задач беларускага мовазнаўства. Яно адкрывае шырокія магчымасці для ўстанаўлення асноўных мадэлей, тыпаў, заканамернасцей, якія складаюць у цэлым сістэму адтапонімных дэрыватаў (ад’ектонімаў), пэўных гістарычных перыядаў, для выяўлення асаблівасцей дадзенага пласта лексікі. Л.М.Шакун надаваў асабліва важнае значэнне дыяхранічнаму вывучэнню словаўтварэння. На яго думку, “дыяхранічны аспект вывучэння словаўтварэння дае магчымасць растлумачыць, як выпрацоўваліся ў мове словаўтваральныя сродкі і складваліся ўзоры, па якіх адбываецца ўтварэнне паасобных слоў, як змяняліся на працягу развіцця мовы яе словаўтваральныя правілы і г.д.” [1, с.7].

У прапанаваным артыкуле разглядаюцца адтапонімныя дэрываты, засведчаныя ў “Актах, издаваемых Виленскою археографическою комиссиею” XVI–XVIIстст. [2]. Аб’ект даследавання складаюць ад’ектонімы, матываваныя тапонімамі-назоўнікамі мужчынскага, жаночага і ніякага роду. Зыходзячы з родавых паказчыкаў тапонімаў, выдзяляюцца класіфікацыйныя падгрупы:

1) ад’ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме мужчынскага роду;
2) ад’ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме жаночага роду;
3) ад’ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме ніякага роду.

Граматычны род назоўнікаў-тапонімаў вызначаецца паводле тых жа фармальных адзінак, што і ў апелятыўных назоўніках [3, с.65]. Тапонімы на мяккі зычны, а таксама цвёрды, зацвярдзелы і заднеязычны адносяцца да мужчынскага роду, тапонімы на –а/-я – да жаночага, тапонімы на -о, -е – да ніякага. У межах тапонімаў пэўнага граматычнага роду вылучаюцца тыя, фіналіі якіх аб’яднаны агульнасцю якога-небудзь структурнага элемента, напрыклад, -ръ (*Миръ, Мозыръ*) або традыцыйнага тапонімнага фарманта, напрыклад, -ецъ, -ка і інш. (*Березовецъ, Ботвиновка, Волковыйскъ, Зубриковщина, Менскъ, Озерница, Орехово*).

Асноўнай адзінкай аналізу словаўтварэння ад’ектонімаў з’яўляецца словаўтваральны тып, вызначэнне якога зроблена на аснове ўжо сфарміраванага і найбольш прызнанага ў лінгвістыцы падыходу да яго выдзялення: “Словаўтваральны тып – гэта схема (формула) будовы вытворных слоў, якая характарызуецца агульнасцю трох элементаў: 1) часціны мовы ўтваральнай асновы; 2) семантычных суадносін між вытворнымі і ўтваральнымі; 3) фармальнага суаднясення паміж вытворнымі і ўтваральнымі, менавіта: агульнасцю спосабу словаўтварэння, а для афіксальных спосабаў тоеснасцю афікса” [4, с.182]. Аналіз ад’ектонімаў, матываваных тапонімамі-назоўнікамі мужчынскага, жаночага і ніякага роду, паказвае, што маюцца ўсе тры паказчыкі для выдзялення словаўтваральных тыпаў: 1) назоўнікі-тапонімы ў якасці словаўтвальных асноў; 2) вытворнае слова паводле лексічнага значэння суадносіцца з семантыкай утваральнай асновы, хаця і адрозніваецца прыналежнасцю да лексіка-граматычнага класа прыметнікаў і сінтаксічнай функцыяй у сказе; 3) суфіксальны спосаб утварэння (суфікс –ск- і яго вытворныя).

## І. Ад’ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме мужчынскага роду

Для ўтварэння такіх ад’ектонімаў выступаюць тапонімы з наступнымі фінальнымі структурнымі элементамі і тапонімнымі фармантамі: -ецъ, -инъ (-ынъ), -ль, -мъ, -нь, -овъ (-авъ -евъ), -окъ, -ръ, -скъ (-цкъ). Разгледзім утварэнне ад’ектонімаў кожнай групы паасобку:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1. Ад'ектонімы ад тапонімаў на –**ецъ**: *Березовецъ – березовский, Везовецъ – везовецкий, Воронецъ – воронецкий, Дворецъ – дворецкий, Здетовецъ – здетовецкий, Ивенецъ – ивенецкий, Каменецъ – каменецкий, Киевецъ – киевецкий, Кремянецъ – кремянецкий, Куренецъ – куренецкий, Лулинецъ – лулинецкий, Лунинецъ – лунинецкий, Олховецъ – олховецкий, Пустынецъ – пустынъский, Радецъ – радецкий, Ратомецъ – ратомский, Снопотецъ – снопоцкий, Топелецъ – топелеский, топилицкий.*

Ад'ектонімы гэтай групы ўтвараюцца, як правіла, шляхам спалучэння поўнай утваральнай асновы тапоніма з суфіксам –ск-, але пры гэтым адбываецца асіміляцыя і спрашчэнне групы зычных (цск –→ цк) тыпу *Везовецъ – везовецкий, Воронецъ – воронецкий, Дворецъ – дворецкий, Каменецъ – каменецкий, Лулинецъ – лулинецкий* і інш., што, відавочна, звязана з законамі спалучальнасці гукаў і іх вымаўленнем. Адзначаецца толькі некалькі дэрыватаў, працэс утварэння якіх з'яўляецца выключэннем з агульнай схемы. Так, ад тапоніма *Березовецъ* засведчаны ад'ектонім *березовский* (а не *березовецкий*), ад *Пустынецъ – пустынъский* (а не *пустынецкий*), ад *Ратомецъ – ратомский* (а не *ратомецкий*), ад *Топелецъ – топелеский* (а не *топелецкий*), дзе назіраецца ўсячэнне фіналіі -ец утваральнай асновы пры далучэнні суфікса –ск-. Адзінкавыя прыклады гэтай групы ілюструюць "пропуск" часткі асновы тыпу *Снопо**те**цъ – снопоцкий*, а таксама варыянтнасць утварэння ад'ектонімаў тыпу *топелеский, топилицкий* ад *Топелецъ*, пры гэтым другі варыянт (*топилицкий*) адпавядае агульнай схеме ўтварэння, але выдзяляецца менай галосных у корані ў параўнанні з тапонімам: *топ**или**цкий – Топ**еле**цъ.*

2. Ад'ектонімы ад тапонімаў на –**инъ (-ынъ)**: *Воинъ – воинский, Деречынъ – деречынский, Дивинъ – дивинский, Добучинъ – добучинский, Дрогичинъ – дрогичинский, Зебинъ – зебинский, Злобинъ – злобинский, Именинъ – именинский, Качынъ – качынъский, Кобринъ – кобринский, Криничинъ – криниченский, Кундинъ – кундинъский, Лулинъ – лулинецкий, Лунинъ – луненский, Люблинъ – любелский, Мироминъ – мироминский, Стрешынъ – стрешынский, Трышынъ – трышынский, Тыкоцынъ – тыкоцинский, Церынъ – церынский, Шебринъ – шебринский, Шешкинъ – шешкинский.*

Большасць з дадзеных вышэй ад'ектонімаў утворана спалучэннем поўнай асновы тапонімаў з суфіксам –ск- тыпу *Воинъ – воинский, Деречынъ – деречынский, Дивинъ – дивинский, Добучинъ – добучинский* і інш. Адступленнем ад агульнай схемы ўтварэння з'яўляюцца словаўтваральныя пары *Лулинъ – лулинецкий, Люблинъ – любелский.* У першым выпадку ўтварэнне адбылося па іншай мадэлі (з дабаўленнем суфікса -ецк-), што, відавочна, звязана з уплывам аналогіі афармлення ад'ектонімаў першай групы, параўн.: *Лунинецъ – лунинецкий.* У другім выпадку маюць месца ўсячэнне фіналіі -инъ утваральнай асновы пры далучэнні суфікса –ск- і ўключэнне галоснага -е-, каб пазбегнуць спалучэння зычных блск, цяжкага для вымаўлення і нехарактэрнага для беларускай мовы.

3. Ад'ектонімы ад тапонімаў на –**ль**: *Вортоль – вортольский, Гомель – гомельский, Лукомль – лукомский, Любомль – любомский, Мядель – мядельский, Невель – невельский, Ойракголь – ойракгольский, Посволь – посвольский, Скидель – скидельский, Супрасль – супрас(ль)ский, Шавель – шавъленъский.*

Для ўтварэння такіх ад'ектонімаў характэрна тое, што большасць з іх утворана ад спалучэння поўнай асновы тапоніма і суфікса -ск- тыпу *Вортоль – вортольский, Гомель – гомельский, Мядель – мядельский, Невель – невельский* і інш. Выключэнне з агульнай схемы ўтварэння складаюць такія пары, як *Лукомль – лукомский, Любомль – любомский*, дзе назіраецца ўсячэнне фіналіі –ль утваральнай асновы пры далучэнні суфікса –ск-, а таксама *Шавель – шавъленъский*, дзе назіраецца пры ўтварэнні ад'ектоніма інтэрфіксацыя (інтэрфікс –енъ-) на стыку ўтваральнай асновы і суфікса -ск-, што дае магчымасць вызначаць вытворны суфікс –енск-.

4. Ад'ектонімы ад тапонімаў на –**мъ**: *Слонимъ – слонимский, Ратомъ – ратомский.*

Гэтыя ад'ектонімы ўтвараюцца шляхам спалучэння поўнай утваральнай асновы тапонімаў з суфіксам -ск- без якога-небудзь тыпу змен.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

**5.** Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–нь**: *Бытень – бытенский, Игумень – игуменский, Камень – каменский, Кодень – коденский, Теребунь – теребуньский*.

Ад'ектонімы гэтай групы ўтвораны ў выніку спалучэння поўнай утваральнай асновы тапоніма з суфіксам –ск-, але якасць канцавога зычнага матывавальнага тапоніма і канцавога зычнага ў корані ад'ектоніма не супадае: мяккі /н'/ становіцца цвёрдым /н/. Выключэнне складае пара *Теребунь – теребуньский,* дзе мяккасць канцавога зычнага ўтваральнай асновы захоўваецца і ў ад'ектоніме.

6. Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–овъ (-авъ, -евъ)**: *Борисовъ – борисовский, Браславъ – браславский, Быховъ – быховский, Здитовъ – здитовский, Кричевъ – кричевский, Могилевъ – могилевский, Мстиславъ – мстиславский, Осовъ – осовский, Ретовъ – ретовский, Рогачевъ – рогаче(о)вский, Стрыевъ – стрыевский, Туровъ – туровский, Черневъ – черневский, Шкловъ – шкловский, Ясудовъ – ясудовский*.

Усе дадзеныя вышэй ад'ектонімы ўтвораны ў выніку спалучэння асновы тапоніма з суфіксам -ск- без якога-небудзь тыпу змен.

**7.** Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–окъ**: *Городокъ – Городъский, Новогородокъ – Нов(о)городский*.

Такія ад'ектонімы ўтвараюцца ў выніку спалучэння асновы тапоніма з суфіксам –ск-, але паслядоўна назіраецца ўсячэнне ўтваральнай асновы (фарманта -окъ).

8. Ад’ектонімы ад тапонімаў на **–ръ**: *Вилькомиръ – вилькомирский, Володимеръ – володимерский, Миръ – мирский, Мозыръ – мозырский, Погаръ – погарский*.

Ад'ектонімы гэтай групы ўтвараюцца ў выніку спалучэння асновы тапоніма з суфіксам –ск- без якога-небудзь тыпу змен.

9. Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–скъ (-цкъ)**: *Волковыйскъ – волковыйский, Высоцкъ – высоцкий, Клецкъ – клецкий, Крайскъ – крайский, Кревскъ – кревский, Липскъ – липский, Логойскъ – логойский, Луцкъ – луцкий (луцъский), Менскъ – менский, Одельск – одельский, Олевскъ – олевский, Пинскъ – пинский, Полоцкъ – полоцкий, Узловскъ – узловский, Хомскъ – хомский, Шацкъ – шацкий*.

Дадзеныя вышэй ад'ектонімы ўтвараюцца ў выніку спалучэння асновы тапоніма з суфіксам –ск-, але паслядоўна адзначаецца з'ява аплікацыі ўтваральнай асновы тых тапонімаў, у якіх спалучэнне канцавых зычных –ск аманімічна суфіксу –ск-, які далучаецца да асновы, тыпу *Волковыйск – волковыйский, Крайскъ – крайский, Кревскъ – кревский, Липскъ – липский* і інш. Магчыма, такога тыпу словаўтваральныя пары ілюструюць і з'яву накладання ( суфікс –ск- і спалучэнне канцавых зычных –ск). Пры далучэнні суфікса –ск да ўтваральнай асновы тапоніма на –цкъ назіраюцца такія марфаналагічныя змены, як спрашчэнне і накладанне, тыпу *Высоцкъ – высоцкий, Клецкъ – клецкий* і інш. Заўважаны адзіны выпадак утварэння варыянтных ад'ектонімаў тыпу *луцкий* і *луцъский* ад *Луцкъ*, пры гэтым ад'ектонім *луцъский* характарызуецца захаваннем суфікса –ск- пасля канцавога зычнага ўтваральнай асновы –цъ у параўнанні з ад’ектонімамі ад тапонімаў на –ецъ (група 1), дзе адзначалася ўсячэнне канцавога -къ утваральнай асновы тапоніма.

Як відаць, спалучэнне суфікса –ск- з асновай назоўніка мужчынскага роду адбываецца як без, так і з марфаналагічнымі зменамі, што залежыць ад канцавой(-ых) зычнай асновы. Так, марфаналагічныя змены не адбываюцца пры ўтварэнні ад’ектонімаў ад асноў на -инъ, -ль, -мъ, -овъ (-авъ, -евъ), напрыклад: *Воинъ – воинский, Вортоль – вортольский, Слонимъ – слонимский, Борисовъ – борисовский, Браславъ – браславский, Кричевъ – кричевский.* У астатніх выпадках назіраюцца розныя марфаналагічныя з'явы: чаргаванне (*Кодень – коденский*); інтэрфіксацыя на стыку асновы і суфікса (*Шавель – шавъленъский*); усячэнне (*Новогородокъ – Нов(о)городский*); накладанне (*Кревскъ – кревский*) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## II. Ад’ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме жаночага роду

Для ўтварэння такіх ад’ектонімаў выступаюць тапонімы з наступнымі фінальнымі структурнымі элементамі і тапонімнымі фармантамі: -а, -ка (-овка), -ица (-ыца), -на (-ня), -щизна (-щина). Разгледзім утварэнне ад’ектонімаў кожнай групы паасобку:

1. Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–а**: *Айна – айнский, Бражела – бражельский, Веграта – вепрацкий, Володава – володавский, Ворша – оршанский, Ганнута – ганнуцкий, Гривда – гривдицкий, Добруша – добруский, Ейрагола – ейрагольский, Коложа – колож(ин)ский, Корма – кормениский, Лаша – лаский, Лебеда – лебедский, Лида – лидский, Ляда – лядский, Ожа – ожский, Олыта – олитский, Осташа – осташский, Росоша – росошский, Ромикгола – ромикгольский, Серебрица – серебрицкий, Турея – турейский, Явора – яворский.*

Для ўтварэння дадзеных вышэй ад’ектонімаў характэрна тое, што большасць з іх утворана спалучэннем асновы тапоніма з суфіксам –ск- без якіх-небудзь марфаналагічных з’яў тыпу *Айна – айнский, Володава – володавский, Лебеда – лебедский* і інш. Пры ўтварэнні некаторых ад’ектонімаў назіраюцца пэўныя марфаналагічныя з’явы: 1) чаргаванне цвёрдага канцавога зычнага ўтваральнай асновы з мяккім у ад’ектоніме (л – л’) тыпу *Бражела – бражельский, Ейрагола – ейрагольский, Ромикгола – ромикгольский*; 2) чаргаванне ў спалучэнні з спрашчэннем групы зычных (**тск** змяняецца на **цк** тыпу *Веграта – вепрацкий, Ганнута – ганнуцкий,* **щск** змяняецца на **ск** тыпу *Серебрица – серебрицкий*); 3) усячэнне тыпу *Добруша – добруский, Лаша – лаский*; 4) уключэнне інтэрфікса пры далучэнні суфікса –ск- да ўтваральнай асновы на спалучэнне канцавых зычных тыпу *Ко**рм**а – кор**мени**ский, Ворша – ар**шан**ский,* пры гэтым пры ўтварэнні ад’ектоніма ў апошняй словаўтваральнай пары знікае прыстаўны в; 5) інтэрфіксацыя і спрашчэнне пры далучэнні суфікса –ск- да асновы тапоніма на -д у адзінкавай словаўтваральнай пары тыпу *Гривда – гривд**иц**кий.*

2. Ад’ектонімы ад тапонімаў на **–ка (-овка)**: *Ботвиновка – ботвиновский, Вака – вацкий, Гоголика – гоголицкий, Грабовка – грабовский, Квасовка – квасовский, Липовка – липовский, Пещатка – печ(щ)ацкий, Полонка – полонский, Тетеровка – тетеровский.*

Пры ўтварэнні ад'ектонімаў гэтай групы назіраюцца два тыпы марфаналагічных з'яў: 1) усячэнне фарманта –ка ўтваральнай асновы пры далучэнні суфікса –ск- тыпу *Ботвиновка – ботвиновский, Грабовка – грабовский* і інш.; 2) чаргаванне ў спалучэнні са спрашчэннем групы зычных (**кск** змяняецца на **цк**) тыпу *Вака – вацкий, Гоголика – гоголицкий,* (**тск** змяняецца на **цк)** тыпу *Пещатка – печ(щ)ацкий.*

3. Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–ица (-ыца)**: *Колпеница – колпеницъкий, Лешница – лешницкий, Лошыца – лошыцкий, Мриница – мриницъкий, Озерница – озерницкий, Осовница – осовницкий, Речица – ръчицъкий, Трилесица – трилисицкий.*

Усе гэтыя ад'ектонімы ўтвараюцца пры далучэнні да асновы тапоніма суфікса –ск-, у выніку чаго назіраецца асіміляцыя і спрашчэнне групы зычных (цск → цк).

4. Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–на (-ня)**: *Городня – городненский, Жолкиня – жолкинский, Лососна – лососинский, Теребня – теребенский.*

Утварэнне такіх ад'ектонімаў суправаджаецца наступнымі марфаналагічнымі з’явамі пры далучэнні суфікса –ск да ўтваральнай асновы тапоніма: 1) чаргаваннем мяккага зычнага /н’/ асновы тапоніма з цвёрдым зычным /н/ ад’ектоніма тыпу *Жолкиня – жолкинский;* 2) устаўнымі галоснымі ( и,е), каб пазбегнуць нехарактэрнага для беларускай мовы і цяжкага для вымаўлення спалучэння зычных снск, бнск тыпу *Лососна – лососинский, Теребня – теребенский*; 3) інтэрфіксацыяй -ен тыпу *Горо**дня** – город**нен**ский.*

5. Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–щизна (-щина)**: *Абрамовичовщизна – абрамовичовский, Абрамовщизна – абрамовский, Войшнаровщина – войшнаровский, Грешниковщизна – грешниковский, Зубриковщина – зубрыковский, Ивановщизна – ивановский, Козаковщизна – козаковский, Мелентеевщизна – мелентеевский, Харытоновщина – харытоновский.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ад'ектонімы гэтай групы ўтвараюцца ў выніку спалучэння асновы тапоніма з суфіксам
-ск-, пры гэтым паслядоўна назіраецца ўсячэнне ўтваральнай асновы (фармант -щизна /-щина).

Як відаць, пры ўтварэнні ад'ектонімаў ад назоўнікаў-тапонімаў жаночага роду найбольш часта назіраюцца марфаналагічныя з'явы, сярод якіх: усячэнне (*Лососна – лососинский, Зубриковщина – зубрыковский, Липовка – липовский*); інтэрфіксацыя (*Ворша – ар**ша**нский*), што тлумачыцца неабходнасцю пазбегнуць спалучэння груп зычных. Калі ж аснова заканчваецца на адзіночны зычны, то часцей ніякіх змен не адбываецца (*Явора – яворский*), хаця і тут назіраецца ўсячэнне (*Лаша – лаский*), чаргаванне ў спалучэнні з спрашчэннем (*Ганнута – ганнуцкий*), хаця паслядоўнасці ў залежнасці ад якасці зычнага не назіраецца, параўн.: *Добруша – добруский* і *Осташа – осташский.*

## ІІІ. Ад’ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме ніякага роду

Для ўтварэння такіх ад’ектонімаў выступаюць тапонімы з наступнымі фінальнымі структурнымі элементамі і тапонімнымі фармантамі: -е, -ино (-ыно, -но), -о, -ово (-ево). Разгледзім утварэнне ад’ектонімаў кожнай групы:

1. Ад’ектонімы ад тапонімаў на **–е**: *Берестье – берестейский, Веве(Вьевье) – вевейский, Волме – волменский, Городище – городиский, Заболотье – заболоцький, Заборъе – заборский, Зазерье – зазерский, Замостье – замостский, Заозерье – заозерский, Заречье – зарецкий, Засулье – засульский, Заценье – заценъский, Ополе – опольский, Поднетечье – поднетецкий, Поръчье – порецкий, Утье – утейский.*

Пры ўтварэнні дадзеных вышэй ад’ектонімаў заўважаюцца наступныя марфаналагічныя з’явы: 1) усячэнне асновы тапоніма пры далучэнні суфікса -ск-, г.зн. немагчымасць спалучэння зычнага /j’/ асновы з суфіксам –ск-, тыпу *Зазерье – зазерский, Заценье – заценъский* і інш.; 2) інтэрфіксацыя паміж спалучэннем зычных утваральнай асновы і суфіксам –ск- тыпу *Берестье – берест**ей**ский, Волме – волм**ен**ский* і інш.; 3) спрашчэнне груп зычных тск і чск на цк тыпу *Заболотье – заболоцький, Заречье – зарецкий* і інш.

2. Ад'ектонімы ад тапонімаў на **–ино (-ыно, -но)**: *Волчино – волчицкий, Дубно – дубенский, Житино – житинский, Ковно – ковенский, Корощино – корощинский, Крошино – крошинъский, Липично – липичанский, Молодечно – молодечанский (молодеченьский), Пожежыно – пожежынский, Тришино – тришиникский, Тяпино – тяпинский.*

Гэтыя ад’ектонімы ўтвораюцца ў выніку спалучэння ўтваральнай асновы з суфіксам –ск- як без змен тыпу *Житино – житинский, Крошино – крошинъский* і інш., так і са зменамі: устаўка галосных а, е паміж канцавымі зычнымі ўтваральнай асновы, каб пазбегнуць спалучэння чатырох зычных ва ўтворанай аснове, тыпу *Ду**бн**о – дуб**е**нский, Ко**вн**о – ков**е**нский, Молоде**чн**о – молодеч**а**нский*; інтэрфіксацыя ў прыкладзе тыпу *Тришино – тришин**ик**ский*. У адным выпадку назіраюцца нехарактэрныя змены на стыку асновы на -ин- і суфікса –ск- тыпу *Волчино – волчицкий.*

3. Ад’ектонімы ад тапонімаў на **-о**: *Новоместо – новоместский, Торговиско – торговиский.*

У першай словаўтваральнай пары пры далучэнні суфікса –ск- да ўтваральнай асновы марфаналагічных змен не назіраецца, а ў другой мае месца накладанне марфем (аснова на –ск + суфікс –ск-).

4. Ад’ектонімы ад тапонімаў на **–ово (-ево)**: *Баркалабово – баркалабовский, Блошнево – блошневский, Бовнарово – бовнаровский, Болотково – болотковский, Ваганово – вагановский, Вишнево – вишневский, Гатово – гатовский, Гернево – герневский, Горбово – горбовский, Горново – горновский, Грынково – грынковский, Гулево – гулевский, Дарово – даровский, Демидково – демидковский, Драчково – драчковский, Заблудово – заблудовский, Колдычево – колдычовъский, Коренево – кореневский, Косово – косовский, Костенево –*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*костеневский, Крокиново – крокиновский, Ланчуново – ланчуновский, Лебедево – лебедевский, Линково – линковский, Лушнево – лушневский, Лысково – лысковский, Минково – минковский, Молодово – молодовский, Ольдово – ольдовский, Орехово – оръховский, Острово – островский, Почапово – почаповский, Путилово – путиловский, Пырешево – пырешевский, Ранково – ранковский, Скоково – скоковский, Соколово – соколовский, Стахово – стаховский, Филипово – филиповский, Хмълево – хмълевский, Шерешево – шерешевский (шершевский), Шутково – шут(д)ковский, Яблоново – яблоновский, Яново – яновский.*

Для ад'ектонімаў гэтай групы характэрна ўтварэнне іх ад поўнай асновы тапонімаў пры дапамозе суфікса -ск- без якіх-небудзь змен.

Як відаць, утварэнне ад'ектонімаў ад назоўнікаў-тапонімаў ніякага роду адбываецца шляхам спалучэння суфікса –ск- з утваральнай асновай як без якога-небудзь тыпу марфаналагічных змен тыпу *Ополе – опольский*, так і са зменамі, якія выкліканы ў большасці выпадкаў нехарактэрным для беларускай мовы спалучэннем з чатырох зычных (*Молодечно – молодечанский*) ці заканамернасцю змен пры спалучэнні зычных асновы з суфіксам -ск- ( ч + ск = цк) тыпу *Поръчье – порецкий*.

Такім чынам, на падставе даследаванага матэрыялу вынікае, што ад'ектонімы ўтвараюцца ад асноў тапонімаў пры дапамозе суфікса –ск-, які далучаецца да асновы назоўнікаў усіх трох родаў. Далучэнне суфікса –ск- да ўтваральнай асновы назоўніка-тапоніма можа адбывацца без змен і са зменамі марфаналагічнага характару, што залежыць ад якасці канцавога зычнага ці спалучэння зычных утваральнай асновы. Паслядоўна заўважаецца ўтварэнне ад'ектонімаў без суправаджэння марфаналагічных з'яў тады, калі аснова заканчваецца на -инъ/-ынъ, -ль, -мъ, -овъ/-авъ/-евъ назоўнікаў мужчынскага роду, на -ово/-ево назоўнікаў ніякага роду. Іншыя зычныя асновы не спалучаюцца з суфіксам -ск- без змен. Апошняе характэрна і тады, калі спалучэннем зычных, далучэнне да якіх суфікса –ск- суправаджаецца рознымі марфаналагічнымі з'явамі.

**Літаратура**

1.Шакун Л.М. Словаўтварэнне. Мн., 1978. – С. 128.

2.Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею.Вильна, 1865 – 1915, т. 1 – 39.

3.Арашонкава Г.У., Лемцюгова В.П. Словаўтварэнне адтапанімічных прыметнікаў. // Беларуская анамастыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – С. 65.

4.Земская Е.А. Современный русский язык. Словообразование. – М., 1973. – С. 304.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны

Паступіў 25.06.01

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ